МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

12 красавіка 2017 г.
№ 12 (396)



стар. 3

**Прыватную ініцыятыву неабходна разняволіць**



стар. 5

**Моладзь з Лёзна навучаецца парламентарызму**



стар. 7

**Самакіраванне пачынаецца... з уласнага пад'езда**

ЁСЦЬ ПРАПАНОВА!

# ХУТАР ПАД ЗНОС



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Як пазбавіцца ад старых будынкаў? Улады Воранаўскага раёна лічаць, што патрэбна абласная праграма з удзелам меліяратараў.**

ТРУХЛЯВЫХ дамоў, якія стаяць у запусценні, з кожным годам становіцца больш, канстатуе **старшыня Воранаўскага раённага Савета дэпутатаў Віктар РОІК**. Праблема іх зносу хоць і вырашаецца, але вельмі марудна. З аднаго боку, узнікаюць цяжкасці з пошукам гаспадароў і судовымі працэдурамі, з другога — сам працэс зносу не танны.

— Мы праводзім работу згодна з рэкамендацыямі абласнога Савета дэпутатаў, ёсць пакрокавы план, як весці юрыдычныя працэдуры, — тлумачыць Віктар Роік. — Мы на месцы распрацавалі свой алгарытм дзеянняў, бо ў нас спецыфічны раён — вельмі многа хутароў, яшчэ нядаўна было больш за тысячу.

Зараз гэта лічба крыху зменшылася, і сёння іх 850! Прыкладна палова стаяць пустымі. Іх трэба зносіць.

— Раней людзі ахвотна бралі зямлю, будаваліся там. Вялі гаспадарку. Цяпер час змяніўся, хутары пазарасталі травой, многія нашчадкі з'ехалі, нават у правы спадчыны не ўступілі, бо не бачаць перспектывы ў гэтым, — кажа старшыня райсавета.

І задаецца пытаннем: як такіх гаспадароў прымусіць парадак навесці? Тым не менш для зносу трэба атрымаць згоду ўладальнікаў жылля. А многія з іх жывуць у суседняй Літве. З'ехалі, калі яшчэ межаў не было, і цяпер адшукаць іх там няпроста. Але і тыя развалюхі, якія перайшлі па рашэнні суда ва ўласнасць сельскіх Саветаў, не так лёгка разабраць, а тым больш — прадаць. Таму ў раёне заахвочваюць мясцовыя СПК, якім пераходзіць зямля пад севазварот. Яны і бяруць на сябе выдаткі па зносе старых хутароў. У выніку і парадак навокал, і зямля дае аддачу.

— Мы сабе нават задачу паставілі — 3—5 пустых дамоў штогод будзе разбірацца. А гэта да 70 сотак зямлі, а то і гектар — выгадна, таму кіраўнікі гаспадарак ідуць на гэта, — удакладняе Віктар Роік.

Акрамя хутароў, трэба зносіць трухлявыя дамы ў вёсках. Там пакінутых развалюх больш за палову. А ў адзінаццаці населеных пунктах і наогул ніхто не жыве. Да разбору такіх дамоў і прыбудоў прыцягваюць мясцовых жыхароў. Зараз на чарзе вёска Мніхі (у Жырмунскім сельсавеце), дзе пражывае адзін чалавек.

— Аб'ёмы з кожным годам растуць, таму гэту справу трэба весці арганізавана, — лічыць Віктар Роік. — Абавязкова задзейнічаць камунальнікаў, якія на месцы перапрацоўваюць зараснікі каля дамоў у дранку. Падлічылі, што затраты акупяцца — і на паліва, і на падаткі.

стар. 4

ЗАБАЎЛЯЛЬНАЯ ПРАГРАМА

# КУЛЬТУРА З «ІСКРЫНКАЙ»

**Ці можа сельскі Дом культуры супрацьстаяць гарадскім спакусам і як схіліць наведвальнікаў да мясцовага культурнага адпачынку? Адказы на пытанні мы шукалі ў Вярэйках Ваўкавыскага раёна.**

## ПАД АДНЫМ ДАХАМ

Акуратны, нядаўна адрамантаваны будынак кожнаму сустрэчнаму даводзіць, што «мастацтва належыць народу», праз надпіс над дзвярамі. Лозунг застаўся яшчэ з 1968 года, калі ў вёсцы з'явілася ўстанова культуры. Прыблізна ў той жа час тут будаваліся і іншыя аб'екты, вось толькі сёння некаторыя з іх напаўпустыя — будаўніцтва ішло з размахам і запасам, але цяпер колькасць жыхароў аграгарадка вагаецца на ўзроўні тысячы чалавек. Тым незвычайней, што ў Доме культуры няма запусцелых пакояў.

— Гуртаваць культуру пад адным дахам характэрна для сельскай мясцовасці, — кажа **старшыня Вярэйкаўскага сельскага Савета Анатоль СТАСЮКЕВІЧ**. — Звычайна блізкімі сферамі дзейнасці займаюцца адны і тыя ж работнікі, а разносіць па асобных будынках тую ж дыскатэку і кіназалу — навошта? Так зручна для наведвальнікаў, а кіраўніцтва эканоміць сродкі і памяшканні.

Сапраўды, Дом культуры ў Вярэйках нагадвае бабулін куфэрак. Пад адным дахам, акрамя згаданай танцавальнай пляцоўкі і кіназалы з магчымасцю дэманстрацыі фільмаў у 3D (пры неабходнасці зала ператвараецца ў канцэртную), знаходзяцца памяшканні для гурткоў, бібліятэка, зала для заключэння шлюбу. Дарэчы, у Ваўкавыску пакуль толькі плануецца пабудова загса, так што маладыя пары Вярэйкаўскага сельсавета ў гэтым плане нават наперадзе райцэнтра.

Задзейнічана і прастора побач. Летам на пляцоўцы за клубам усталёўваюцца парасоны летняй кавярні, адгароджваецца ўчастак з газонам і дзіцячымі атракцыёнамі. Крыху далей, на беразе возера, — вулічная сцэна для масавых канцэртаў.

## ДЗЕ ШУКАЦЬ ГЛЕДАЧА

Пенсійнага ўзросту дасягнула прыкладна трэцяя частка жыхароў сельсавета. Моладзь у асноўным працуе ў сельскагаспадарчым прадпрыемстве «Ваўкавыскае», таксама вялікая доля занятая ў сферы адукацыі і медыцыны.

стар. 6




Вярэйкаўскі Дом культуры пабудаваны пяцьдзясят гадоў таму, але тагачасны лозунг на яго фасадзе актуальны і сёння.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.